# «ОХ, І НАГАРАВАЛІСЯ Ж МЫ, ДЗЕТАЧКА…»

## З успамінаў М.А. Пазняк, в. Мінчыкі

Марыя Аляксандраўна Пазняк сама з Верхаўлян, там нарадзілася і вырасла, там пражыла ўсё сваё жыццё. І толькі ў апошні час, калі стала падводзіць здароўе, дачка забрала яе ў Вялікую Бераставіцу. Тут, у кватэры, усе выгоды: і вада на месцы, і ацяпленне. Але баба Маня сумуе па сваёй хатцы і не раз кажа, што каб вочы трохі лепш бачылі ды ногі былі б мацнейшымі, дык і не сядзела б тут, а паехала б у свае Верхаўляны.

Марыі Аляксандраўне ідзе 84-ы год. У 1941-м, калі пачыналася вайна, яна была яшчэ 14– гадовым падлеткам. Вядома, за даўнасцю часу многае сцерлася з памяці, але забыць ваенныя гады проста немагчыма…

- Нас у сям'і было пяцёра дзяцей, – кажа баба Маня. – Я - старэйшая, сястра Гандзя 12 гадкоў мела, а астатнія дзеці яшчэ меншыя, самаму малодшаму, Ванечку, толькі годзік споўніўся. У той дзень, калі пачалася вайна, раніцай мы з бацькам выйшлі на загуменне. На вуліцы стаяў страшэнны гул ад самалётаў і недзе ў баку Крынак чуліся выбухі, стаяў чорны дым. Да нас падышоў сусед, і бацька яму кажа: «Мабыць, манеўры ідуць». Сусед толькі сумна махнуў рукой: «Якія манеўры, чалавеча, скажы гэта дзіцяці, – і паказаў на мяне. – Гэта ж вайна, вайна…»



*М.А. Пазняк.*

У абед ужо стала вядома, што пачалася вайна. Назаўтра ўсіх мужчын з вёскі забралі, але адправіць на фронт не паспелі: вораг ужо быў зусім блізка, і яны вярнуліся дадому.

Як уваходзілі немцы ў вёску, я не памятаю: мы ўсе, і дарослыя, і дзеці хаваліся ў скляпах. У самых Верхаўлянах немцаў не было, яны толькі час ад часу наязджалі. Памятаю, мы з мамай былі ў двары, а падышоў немец і кажа: «Эйма, эйма…» Бачыш, колькі часу прайшло, а і сёння памятаю тое нямецкае слова, гэта ён так вядро прасіў, каб каня напаіць.

За вёскай у нас гарадзішча, за ім недалёка альшына была, і там мужчыны коней пасвілі. Аднойчы з той альшыны партызаны немцаў абстралялі, забіць не забілі, але за гэта немцы ўсіх мужчын і хлопцаў з вёскі забралі і пагналі ў Саколку. Мама насіла татку перадачы, дык

немец ёй так і сказаў: “За аднаго нашага вашых сто знішчым...” Вось і знішчылі ўсіх нашых мужчын у Беластоку, і татку майго разам з імі. Засталася мама адна з пяццю дзецьмі на руках. Але і на гэтым беды нашы не закончыліся. Праз нейкі час прыйшлі немцы ў вёску і пачалі ўсіх жанчын з дзецьмі з хат выганяць. Мама толькі і накінула коўдрачку на калыску з Ванечкам, так і пайшлі. А суседцы немец сказаў: “Бяры ўсё, што можаш, табе спатрэбіцца”.

Дык вось, выгналі нас з хат і вёску падпалілі. Колькі крыку і плачу было, табе не перадаць словамі. Хат з 40 было ў Верхаўлянах, усе пагарэлі, а куды людзям дзявацца? Мама з намі пайшла адразу ў Гольні, да татавай сястры, потым адзін час у Кордзіках жылі, затым зноў у Гольні вярнуліся. Доўга скіталіся па чужых вуглах. Ох, і нагараваліся мы, дзетачка… Не дай Бог каму такое перажыць. Маці і жабраваць прыходзілася, разам з адной такой жа гаротніцай ездзілі ў Навікі (цяпер Ваўкавыскі раён. – **Рэд.**), хадзілі па хатах, каб хоць трохі чаго сабраць, каб дзеці з голаду не пагінулі.

Я каровы пасвіла, з сястрой і касіць прыходзілася. Нават дзядзька – сусед казаў, што не ўсе мужчыны так умеюць касіць, як мы, дзяўчаты. А што ж, усё даводзілася рабіць, бо старэйшай была.

Помню дзень, калі адыходзілі немцы: прачнуліся з ранку, выйшлі на вуліцу, а там ляжыць забіты конь і жанчына з Гольняў, відаць, выйшла на вуліцу і трапіла пад кулю, а немцаў ужо няма, пайшлі…

Пасляваенныя гады таксама не былі лёгкімі. Вярнуліся ў сваю вёску, пачалі адбудоўваць знішчаныя сядзібы. Спачатку жылі ў хляве, ён быў у нас гліняны, не зусім згарэў, паціхеньку будавалі хату, што людзі дапамагалі, а што і самім даводзілася.

Потым замуж пайшла, муж мой быў сірата, аддалі яму сваякі старэнькую хату, перавезлі мы яе ў Верхаўляны і пачалі абжывацца. Дачка нарадзілася, потым сын адразу за ёю. А мужа, Ваню майго, у армію забралі. Засталася я з дзеткамі малымі адна: дачцэ 2 годзікі, а сыну - 7 месяцаў, а на работу ж хадзіць прыходзілася. Пакіну дзяцей дома адных, кажушок на падлозе рассцялю, есці на ім палажу і бягу на працу. Паесці дык яны паядуць, а спаць дачка на ложак залезе, бо крыху большая была, а сынок на падлозе пад сталом так і спіць. Нагараваліся і дзеткі мае…

Потым лягчэй стала, калі муж з арміі вярнуўся, ён шафёрам у калгасе працаваў, я на палявыя работы хадзіла, яшчэ двое дзетак нарадзілася. Усіх выгадавалі, на ногі паставілі. Ужо больш за дзесяць гадоў мінула, як няма майго Вані… Усяго было ў жыцці, вядома, але хіба ж з вайной параўнаеш? Няма большай бяды і страху, як вайной жыць…

Ірына Міклаш, г.п. Вялікая Бераставіца, 2011 год.